АГЕЕЎ
Аляксандр Рыгоравіч

Выкладчык Магілёўскага педінстытута

# АРХІЎНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ АБ ПАЎСТАННІ 1863-1864гг. НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ.

У мінулым годзе на кафедру гісторыі і культуры Беларусі Магілёўскага педінстытута, у музеі Магілёва даволі часта звярталіся краязнаўцы з просьбамі дапамагчы адшукаць тыя, ці іншыя дадзеныя аб паўстанні 1863-1864гг. на Магілёўшчыне . Думаецца, што ўвага да гэтай тэмы не згасне і надалей, а апісанне архіўных матэрыялаў па ёй будзе цікава шырокаму колу аматараў гісторыі.

Большасць дакументаў аб паўстанні, як і ўвогуле архіўных крыніц па дарэвалюцыйнай гісторыі Беларусі, захоўваецца ў Нацыянальным архіве краіны ў г.Мінску. Частка матэрыялаў выдавалася ў зборніку "Восстание в Литве и Белоруссии 1863-1864 гг." да стагоддзя падзеі. Там ёсць пэўныя дакументы і па Магілёўскай губерніі.[1] Але іх няшмат. Не можа сёння цалкам задаволіць і іх падбор. Большасць жа архіўных крыніц вядома толькі спецыялістам.

Дакументы аб паўстанні на Магілёўшчыне ў асноўным захоўваюцца ў фондах розных устаноў Магілёўскай і, часткова, Мінскай губерній. Так, у фондзе Магілёўскага губернскага праўлення (ф. 2003) ёсць справы аб вышуку, арыштах, правядзенні вобыскаў і мерах пакарання ўдзельнікаў паўстання. У фондзе канцылярыі Магілёўскага грамадзянскага губернатара (ф.2001) да таго ж у наяўнасці маюцца рапарты ўездных спраўнікаў аб фарміраванні і дзеяннях паўстанцкіх атрадаў.

Пэўныя матэрыялы разгрупаваны і па іншых фондах. Але ж большасць дакументаў знаходзіцца ў фондах "следственных комиссий, учрежденных по делам о восстании 1863-1964 гг. "Яны былі ўтвораны ў красавіку, маі 1863 г. для вядзення следства па справах удзельнікаў паўстання і падпарадкоўваліся віленскаму вайсковаму генерал-губернатору. У Магілёўскай губерніі дзейнічалі следчыя камісіі ў Магілёве, Оршы, Горках, Чэрыкаве, Сянно. Сенненская ўжо ў верасні 1863г. была аб'яднана з аршанскай. Астатнія былі ліквідаваны да сакавіка 1864г. Аднак у сакавіку ж была зноў утворана Магілёўская камісія для канчатковага разбору спраў камісій, ліквідаваных у гарадах Магілёўскай губерніі. Яна дзейнічала да снежня



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

1864г. 3 жніўня 1865г. па студзень 66 г. у Магілёве функцыяніравала спецыяльная камісія, якая расследавала дачыненне да паўстання князей Любамірскіх.

Матэрыялы следчых камісій даволі разнастайныя і багатыя. Тут ёсць і следчыя справы, пратаколы допытаў удзельнікаў паўстання і сведкаў, службовая перапіска і спіскі асоб, якія былі прыцягнуты да дазнання і знаходзіліся пад следствам. Апошняе, мабыць, асабліва важна падкрэсліць, улічваючы цікавасць да складання сваіх радаводаў, пошуку слядоў продкаў, якая існуе сёння ў шырокіх колах грамадства.

Фонд Горацкай следчай камісіі (№3286) мае вопісы №1 (у ім знаходзіцца адна адзінка захоўвання) і №2 (дзве адзінкі). Цікавымі ўяўляюцца сведчанні аб паходжанні, адукацыі навучэнцаў горацкіх навучальных устаноў-удзельнікаў паўстання.[2]

Матэрыялы Аршанскай следчай камісіі сканцэнтраваны у фондзе №3255. У ім два вопісы: №1, №2, у якіх маецца адпаведна 14 і 3 справы. Спісы асоб, якія знаходзіліся пад следствам у Віцебскай, Магілёўскай, Чэрыкаўскай, Сенненскай камісіях, ёсць у справе №2 першага вопісу.[3] У справе №3 утрымліваюцца цікавыя звесткі аб дзеяннях паўстанскіх атрадаў ля Оршы, забяспячэнні іх зброяй і правізіяй.[4] У справе №6 - аб фарміраванні паўстанцкага атрада ў фальварку Зарубы [5], у справе №9 - аб знаходжанні сялянамі вёскі Варнавіна Мсціслаўскага ўезду адозвы "К русским солдатам" і забароненых вершаў на полі маёнтка памешчыцы Віскоўскай [6] і г.д.

Фонд Чэрыкаўскай следчай камісіі (№ 3366) мае 7 спраў. Акрамя традыцыйнай для іншых фондаў перапісак, рапартаў, спісаў асоб-удзельнікаў паўстання, маюцца рапарты станавых прыставаў аб з'яўленні ў чатырох вярстах ад Крычава паўстанцкага атрада колькасцю 3000 чалавек.[7]

Найбольш багатым, разнастайным і цікавым з'яўляецца фонд Магілёўскай следчай камісіі (№3257). У ім захоўваюцца 64 справы ў двух вопісах. Першы вопіс мае 55 спраў. Сярод найбольш цікавых дакументаў: сапраўдны подпіс Л.Тапара (Звяждоўскага)[8], перапіскі аб самавольнай адлучцы ў час паўстання чыноўнікаў магілёўскай казённай палаты і навучэнцаў Магілёўскай губернскай гімназіі;[9] Матэрыялы аб фарміраванні паўстанцкага атрада ў маёнтку памешчыка Н.Цеханавецкага Вышава Мсціслаўскага ўезду і аб ссылцы ў Сібір яго з жонкай Ізабелай.[10]

У пошуку матэрыялаў аб паўстанні могуць дапамагчы і справы іншых камісій: Мінскай (ф.1418), Слуцкай (фонд 1524), Віцебскай (ф.3046). Так, у фондзе Мінскай следчай камісіі маецца перапіска з часовым вайсковым і грамадзянскім губернатарам Мінскай губерні аб зняцці допыта са зняволенай Каміллы Марцінкевіч - дачцы беларускага пісьменніка В.Т.Дунін-Марцінкевіча[11] і іншыя цікавыя дакументы.

Увогуле ж матэрыялаў дастаткова, каб весці канкрэтную краязнаўчую працу.

Спасылкі і заўвагі.

1. Восстание в Литве и Белоруссии. 1863-1864гг.- М.,1965.-С.467-493
2. Нацыянальны архіў, ф.3286, в.2,спр.1
3. Там жа, ф.3255, в.1,спр.2
4. Там жа, спр.3, л.145-153
5. Там жа , спр.6
6. Там жа, спр.9
7. Там жа, ф.3366,в.1,спр.1
8. Там жа, 3257, в.1,спр.1,л.35
9. Там жа, спр.5,10
10. Там жа, в 2,спр.1
11. Там жа,ф.1418,спр.5

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова